# Рэцэнзіі

Т.І. Шамякіна. **Кітайскі каляндар і славянскі міфалагічны бестыярыум: паралелі.** Мн.: РІВШ БДУ, 2007. 104 с

Наколькі мэтанакіравана, актыўна ды плённа на сучасным этапе ў Беларусі вывучаецца і даследуецца сусветная культура і міфалогія як яе неад'емная частка, могуць выдатна пасведчыць шматлікія навуковыя працы прафесара Таццяны Іванаўны Шамякінай. Шырока запатрабаваны цыклы публікацый гэтага аўтара ў вядомым часопісе «Роднае слова», аднымі з самых папулярных, цытуемых маладымі навукоўцамі і студэнтамі, сталі яе манафафіі і дапаможнікі «Міфалогія Беларусі» (2000), «Беларуская класічная літаратура і міфалогія» (2001), «Эсхатология (мифы о потопе)» (2002), «Міфалогія і літаратура» (2003), «Славянская міфалогія. Курс лекцый» (2005), «Культура Кітая» (2006), «Культура Індыі» (2006). Гэты шэраг дапаўняе новая кніга «Кітайскі каляндар і славянскі міфалагічны бестыярыум: паралелі» (2007).

Зварот Т.І. Шамякінай да ўсходняга календаре невыпадковы, паколькі яна даўно цікавіцца старажытнай культурай кітайцаў і іншых народаў. На філалагічным факультэце БДУ прафесар Шамякіна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы студэнтаў-кітаістаў, чытала ім курс «Усходняя міфалогія». Кнігу «Кітайскі каляндар...» можна разглядаць як вынік навуковых зацікаўленняў і лектарскіх напрацовак аўтара. Інтарэс да кітайскага, так званага жывёльнага, календара абумоўлены важнымі мэтамі і задачамі, якія даследчыца актуалізуе ў прадмове да выдання. Яна мяркуе, што разумение жывёл з пункта гледжання міфалогіі «дапаможа нам, людзям, паглыбіцца ў нетры жыцця, ва ўласную прыроду, знайсці сэнс існавання, убачыць сябе часткаю сусветнага цэлага» (с. 3). І яшчэ: «Распавядаючы пра жывёл - знакі-сімвалы ўсходняга календара, мы не маем на ўвазе кіравацца астралагічнай навукай, тым больш займацца прадказаннямі. Мэта ў нас іншая: сцвердзіць нацыянальны, менавіта *беларускі, погляд на ўсходні каляндар,* знайсці першаасновы - *архетыпы* чалавечай культуры -і адсюль - моманты падабенства ў, здавалася б, далёкіх паміж сабою славянскай і кітайскіх цывілізацыях» (с. 5) (вылучана аўтарам манаграфі. - *А. Б.).* Т.І. Шамякіна выяўляе архетыповае, універсальнае і сімвалічнае ў розных культурных традыцыях - найперш тое, што датычыцца ўяўленняў пра жывёл, іх месца і ролі ў сацыяльным, духоўным жыцці чалавека. Каляндар у трактоўцы аўтара кнігі паўстае як цэласная светапоглядная, філасофская сістэма.

Т.І. Шамякіна падрабязна знаёміць з усходнім календаром, цыкл якога складаецца, як вядома, з дванаццаці гадоў, пазначаных задыякальнымі знакамі-сімваламі жывёл. Гэты дванаццацігадовы цыкл і абумовіў адпаведнае структураванне матэрыялу: пачынаючы ад расповеду пра год мышы і да тлумачэння сэнсу анімалістычнага вобраза свінні. Пры гэтым аўтара пастаянна займае тыпалогія кітайскага анімалізму (успрыманне і выяўленне жывёл) і славянскага, уласнабеларускага бестыярыуму (так у сярэднявеччы называлася апісанне жывёл). І як бы ні здавалася парадаксальным, але гэты паглыблены экскурс да першавытокаў свядомасці, архетыпаў дазваляе гаварыць пра падабенства, нават адзінства культурных вобразаў і розных светапоглядных сістэм. Зямная цывілізацыя пачыналася з міфа, з прыродацэнтрызму, г. зн. гарманічнай натурфіласофіі, паводле якой чалавек уключаны ў сусветную плынь часу з яго лінейнасцю і цыклічнасцю, адзіную касмаганічную сістэму. Мудрае светаўладкаванне і адлюстроўвае ўсходні каляндар, змест якога глыбока і ўсебакова раскрываў аўтар кнігі.

Як і заўсёды, чарговая праца Т.І. Шамякінай уражвае сваёй фундаментальнасцю. Тут творча сінтэзаваны багаты вопыт сусветнай культуралагічнай думкі, які да тага ж арыгінальна інтэрпрэтаваны, прычым з вылучэннем цікавых гіпотэз. Аўтар выкладае матэрыял дастаткова навукова, але разам з тым даступна, месцамі займальна, што, безумоўна, падвышае чытацкія вартасці кнігі.

Сёння назіраецца масавая цікавасць да ўсходняга календара, што зрабіўся надзвычай папулярным і запатрабаваным. Напрыклад, да яго шырока звяртаюцца СМІ, каб растлумачыць сімволіку пэўнага знака-вобраза жывёлы, які дае назву чарговаму новаму году. Аднак часам гаворыцца ці пішацца такое, што ў культурнага чалавека выклікае здзіўленне. На парадоксы ў тлумачэнні ўсходняга календара Т.і. Шамякіна звярнула ўвагу ў часопісе «Полымя» (2007, № 3, с. 155). Вось чаму важна мець кампетэнтныя навуковыя крыніцы, як рэцэнзуемае намі даследаванне. Навуковая і практычная карысць яго відавочная, таму і даводзіцца шкадаваць, што кніга пабачыла свет у абмежаванай колькасці экземпляраў. А хацелася б, каб было наадварот! Такія выданні павінны друкавацца вялікімі тыражамі і быць даступнымі для шырокага кола чытачоў. Упэўнены: кніга Т.І. Шамякінай будзе мець поспех у гуманітарнай адукацыйнай і навуковай сферах, асабліва ў

асяродку кітаістаў, яе старонкі прывабяць тых, каго цікавіць поліэтнічны свет з яго разнастайнасцю нацыянальных культур.

***А.І. Бельскі,***
кафедра беларускай літаратуры і культуры